Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам. **(Я.Сіпакоў)**

27 красавіка ў 6 “В” класе прайшло пазакласнае мерапрыемства “Ці ведаеш ты Беларусь?” Вучні з цікавасцю рыхтаваліся да конкурсу-віктарыны. Яны знайшлі разнастайныя пытанні пра нашу краіну, склалі цікавыя крыжаванкі, паказалі свае мастацкія здольнасці ў малюнках. На станцыі “Віншаванне па-беларуску” дзеці складалі віншаванні на роднай мове, а хтосьці вырашыў зрабіць нават свой зборнік пажаданняў. Віктарына спрыяла развіццю творчых здольнасцей вучняў, выхоўвала павагу і любоў да роднай мовы і краіны.







